Сваімі рукамі

# Найлепшая ў кампетэнцыі

## Каму скараецца швейная машынка?

**Дар'я ХІЛЬКО, навучэнка Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці, стала адной з найлепшых на міжнародным чэмпіянаце прафесійнага майстэрства WorldSkills, што праходзіў у Кітаі. У кампетэнцыі «Дызайн адзення» яна атрымала медаль «Найвышэйшае прафесійнае майстэрства».**



У Дашынай сям'і швачак няма. А вось ёй самой з дзяцінства падабалася вязаць і майстраваць.

— На ўроках працоўнага навучання, напэўна, была адной з найлепшых? — цікаўлюся.

— Так, — усміхаецца суразмоўніца. — Гэта быў мой любімы прадмет у школе. Дзяўчаты ўвесь час прасілі дапамагчы ім штосьці пашыць. Настаўнікі адзначалі мае поспехі і казалі, што мне трэба гэтым далей займацца.

Падчас вучобы ў школе Даша не ўдзельнічала ні ў якіх конкурсах. Затое ў каледжы вырашыла нарэшце паспрабаваць свае сілы. Пачын аказаўся ўдалым: заняла другое месца на алімпіядзе па працоўным навучанні, потым атрымала «серабро» на Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus. На чэмпіянаце ў Кітаі дзяўчына была адзначана ганаровай узнагародай: яна якасна выканала ўсе заданні, але крыху недабрала па балах, каб апынуцца ў ліку пераможцаў.

Усім удзельнікам трэба было выканаць некалькі модуляў. Першы — наколка: мадэляванне сукенкі на манекене. Другі — эскіз. Удзельнікам акрэслівалі напрамак моды і давалі ўзор тканіны. А канкурсанты за гадзіну павінны былі стварыць некалькі вобразаў. Трэцяе заданне — зрабіць лякала. Апошні модуль уключаў у сябе пашыў сукенкі. На яго адводзілася дзевяць гадзін. З фасонам кожны вызначаўся сам, але ў вырабе абавязкова павінны былі прысутнічаць пэўныя элементы: кішэня або адразны манжэт і каўнерык-шаль.

— Бачыла работы іншых: ва ўсіх атрымаліся вельмі розныя сукенкі: у кагосьці — кароткія, а ў кагосьці — у падлогу. Але аднолькавых не было, — расказвае Даша.

Па яе словах, суддзі ў першую чаргу ацэньваюць якасць работы і тое, наколькі правільна выкананы ўмовы задання. Старацца справіцца з модулем раней за ўсіх не варта: за хуткасць балаў не налічваюць. Галоўнае — укласціся ў адведзены час.

Пераможцам стала ўдзельніца з Расіі. Другое месца за Аўстраліяй, трэцяе — за Кітаем. «Магчыма, у іх было больш вопыту. Яны крыху старэйшыя за мяне», — разважае дзяўчына.

На практыцы ў каледжы, між іншым, студэнты вучацца шыць усё — ад абрусаў да блуз і паліто. У майстэрню навучальнай установы паступаюць заказы, і дзяўчаты іх выконваюць. Пад наглядам майстра, вядома. Можа ад прадпрыемства прыйсці заданне на пашыў дзесяці камплектаў пасцельнай бялізны, а часам звяртаюцца звычайныя людзі, якія не знаходзяць у краме патрэбнай рэчы ці свайго памеру.

Перад нядаўнімі выпускнымі ў Дашы таксама была работа. Дзяўчына пашыла пад заказ дзве сукенкі і яшчэ падагнала па фігуры некалькі гатовых. А вось для сябе, прызнаецца з усмешкай, лянуецца шыць. За дызайнерамі яна стараецца не сачыць, каб не капіраваць іх ідэі, а імкнецца прыдумляць штосьці сама.

Днямі дзяўчына абараніла дыплом. Яе выпускной работай было дэмісезоннае паліто. Суразмоўніца тлумачыць, што на абароне трэба не толькі прадставіць пашыты выраб, але і апісаць этапы яго стварэння, паказаць разлікі.

На гэтым вучоба для яе не заканчваецца. Даша збіраецца паступаць у каледж — на мадэльера-канструктара. Што да будучага месца работы, то дзяўчына разглядае некалькі варыянтаў: «Папрацавала б у атэльe ці вясельным салоне. Гэта цікава...».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*




# ТРАПІЦЬ У ЭЛІТУ

**Раней, каб пачаць займацца спортам, дастаткова было знайсці ў шафе старыя красоўкі, забытыя там з часоў урокаў фізкультуры, і адправіцца на найбліжэйшы стадыён. Цяпер для першай трэніроўкі набываюць фітнес-гадзіннік, адмысловую бутэльку для вады, пальчаткі... Нічога не забыла?**

Толькі парадокс у тым, што ўсе гэтыя аксесуары і гаджэты не зробяць вас больш спартыўнымі. Растлумачу чаму.

Бадай, самая папулярная пакупка — фітнес-гадзіннік. Ён лічыць, колькі крокаў за дзень вы прайшлі, колькі калорый «спалілі», сочыць за вашым пульсам. Карысныя функцыі. Для тых, хто даўно займаецца спортам і хоча дадаць інфарматыўнасці працэсу, палепшыць якасць трэніровак. На іх колькасці — асабліва калі стартавым пунктам быў нуль — гэта не адбіваецца. Калега вось паўгода таму набыў бранзалет, спадзеючыся, што актыўнасці ў яго жыцці цяпер стане больш. Нядаўна спытала пра вынікі. Аказалася, што спорту не прыбавілася. Максімум — гадзіннік часам стымулюе больш праходзіць пешшу, калі хлопец бачыць, што за дзень і кіламетра не адолеў. Але зразумець, што за сёння ты нават да крамы не прагуляўся, можна і без гаджэта.

У сваіх водгуках карыстальнікі чамусьці адзначаюць функцыі, з фітнесам не звязаныя. «Кожны раз, калі вам хтосьці звоніць, піша, бранзалет паведамляе пра гэта. Я купіў бы яго, нават калі б крокамера і датчыка сэрцабіцця не было», «Набыў і выкарыстоўваю як гадзіннік», «Зручны вібрабудзільнік», «Хацелася б большы экран, каб чытаць SMS»... Гэй, а што наконт спорту?

Аксесуары — асобная тэма. Не ведаю, як мужчыны, а дзяўчаты часцей набываюць іх проста для прыгажосці. Хоць аксесуары маюць пэўнае прызначэнне. Пальчаткі, напрыклад, неабходны, калі падымаеш штангу ці падцягваешся на турніку. Каб абараніць далоні і каб снарад не слізгаў (чытай: для бяспекі атлета). Таму дзіўна іх бачыць на дзяўчатах, якія ўсю трэніроўку не сходзяць з беґавой дарожкі ці працуюць з двухкілаграмовымі гантэлямі. Шэйкеры зручныя для тых, хто ўжывае спартыўнае харчаванне: у гэтых бутэлек шырокае рыльца, таму туды лёгка засыпаць інгрэдыенты. Проста для вады, здаецца, можна падабраць больш танны варыянт (а шэйкер каштуе 10—30 рублёў).

Усе гэтыя прадметы становяцца элементамі стылю. Так бы мовіць, знешней атрыбутыкай, паказчыкам прыналежнасці да элітнай групы (не вядзеш актыўны лад жыцця — лічы, адстаў ад моды). Вядома, падцягнутае цела больш сведчыць аб прыхільнасці да фітнесу, але, каб «зрабіць» яго, трэба папацець. А так заходзіш у залу цалкам экіпіраваны і быццам усім сваім выглядам паказваеш: у гэтай справе я не навічок.

Ну, перад такімі ж навічкамі, як вы, парысавацца можна. А так «зрэжацеся» на першым жа практыкаванні: тэхніка выдасць. (Здавацца спартыўным — увогуле цэлая навука. Бачыла смешны ролік у тэму. Прыгожая дзяўчына прыходзіць у трэнажорку і першай справай шукае, дзе б ёй зрабіць сэлфі. На бегавых дарожках тым часам займаецца некалькі мужчын. Яна падглядае, хто з іх адолеў большую дыстанцыю, і прагане з дарожкі, каб самой сфатаграфавацца на фоне тых лічбаў).

Фітнес-гаджэты мы ўспрымаем як хуткія рашэнні. З мінімумам высілкаў з нашага боку, вядома. Дастаткова толькі надзець той разумны гадзіннік — і ногі самі пачнуць бегаць і прысядаць. Але ж вы памятаеце, што так не бывае.

Хочаце купіць штосьці карыснае? Вазьміце скакалку. Ёсць нават мадэлі з лічыльнікам скокаў. Хаця не, лепш нічога не купляйце. Хопіць збірацца пачаць трэніравацца (нават на паперы гэты збег дзеясловаў дрэнна глядзіцца). Прыгатаванні не набліжаюць да мэты. А вось круг па стадыёне — ужо крок наперад. Нават некалькі сотняў крокаў.

# УЗЯЛІ «ПЛАНКУ»...




Узнагароды і сувеніры пераможцам.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

...А цяпер, увага, самае прыемнае! Абвяшчаем імёны пераможцаў нашага традыцыйнага маладзёжнага творчага конкурсу «Я — малады. І мне не ўсё роўна!..» сезона 2016—2017 года! Першы пераможца (у алфавітным парадку) — **Ірына БУБНОВА,** выпускніца 10 класа СШ №12 г. Маладзечна. Дзяўчына марыць у будучыні стаць журналістам, таму наведвае гурток «Школа журналістыкі» пры цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік». Перамагла Іра ў нашым творчым спаборніцтве з матэрыялам «Данік, здольны весці за сабой» (22.12.2016). Што цікава, як прызнавалася сама аўтарка, дасланая на конкурс работа была яе першай «пробай пяра». Больш за тое, яна стала і першай як адабранай да друку ў ліку іншых... І першым пераможцам мы таксама называем Ірыну Бубнову. Нехта скажа, маўляў, навічкам шанцуе? Нязгодныя, бо аўтарка пацвердзіла сваю ўпартасць у справе авалодання журналісцкім майстэрствам: у рамках конкурсу была змешчана і другая па ліку «проба пяра» дзяўчыны («Тыя пташкоі — як крылы для мары» ад 18.05.2017).

Прадстаўляем наступнага пераможцу — **Ангеліну НОВІКАВУ,** выпускніцу 11 класа гімназіі №1 г. Дзяржынска. Заслужаны поспех дзяўчыне прынёс матэрыял «Калі заклікаю размаўляць на роднай мове — раблю гэта па-беларуску» (6.04.2017). Акрамя конкурсных работы, у маладзёжным дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена» былі надрукаваны яшчэ два матэрыялы аўтаркі, тэмам якіх можа пазайздросціць не толькі абітурыент журфака (а Ангеліна, як вы, мабыць, ужо здагадаліся, таксама збіраецца паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ), але нават і малады спецыяліст. Гэта інтэрв'ю з удзельнікам дзіцячага «Еўрабачання» ад Беларусі («Аляксандр Мінёнак: «Мару стаць сапраўдным артыстам» ад 6.10.2016) і вядомым музычным гуртам («Група «Тяни-Толкай»: «Першы ганарар — палова курыцы» ад 17.11.2016). Як той казаў, а вам слабо? Інтэрв'ю з Сашам Мінёнкам пачыналася з першай паласы маладзёжнага дадатку, што сведчыць пра інтарэс да абранай аўтарам тэмы.

Яшчэ адзін пераможца — **Валянціна ТРУБАЧ,** выпускніца 11 класа гімназіі №10 г. Маладзечна. Ганаровую грамату яна атрымлівае за свой матэрыял «Любімцы па жыцці — коні» (8.06.2017). Гаворачы спартыўнай мовай, у дзяўчыны спрацавала другая спроба, бо апроч «пробы пяра», якая прынесла ёй лаўры пераможцы, у Валянціны была яшчэ адна, крыху ранейшая па часе («Прафесія — толькі па душы» ад 5.01.2017). Дзяўчыне вельмі падабаецца пісаць кароткія замалёўкі, эсэ, сачыненні, нататкі, таму цалкам лагічна яна сёлета збіраецца паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ.

Усе пераможцы па традыцыі атрымалі ад «Выдавецкага дома «Звязда» ганаровыя граматы і каштоўныя сувеніры з сімволікай найстарэйшага і адзінага беларускамоўнага штодзённага выдання краіны, якое праз месяц адзначыць 100-гадовы юбілей. Апроч таго, старэйшым дзяўчатам — Ангеліне Новікавай і Валянціне Трубач, якія сёлета збіраюцца «штурмаваць» журфак, — уручаны яшчэ і рэкамендацыі для паступлення.

Віншуем усіх удзельнікаў конкурсу, асаблівыя віншаванні пераможцам і — удачы ім пры паступленні!

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*
**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Вучоба «ў полі»

# СЛЕД НА ВАДЗЕ

**Дзяржінспектары аховы жывёльнага і расліннага свету Гомельскай вобласці прынялі ўдзел у вучэбным зборы, арганізаваным абласным упраўленнем Следчага камітэта для супрацоўнікаў са стажам менш за два гады.**

Пачынаючыя следчыя, якім даводзіцца расследаваць розныя справы, у тым ліку і факты браканьерства, атрымалі магчымасць набыць практычныя навыкі работы ў сферы прыродаахоўнага заканадаўства.



Як расказалі ў Дзяржінспекцыі, адным з пунктаў для стажыроўкі стаў умоўны выезд на месца незаконнага рыбалоўства. На беразе ракі Сож дзяржінспектары арганізавалі «затрыманне» браканьераў, якія на маторнай лодцы прамышлялі пры дапамозе сетак. Прадэманстравалі следчым і іншыя забароненыя прылады лоўлі. Расказалі, як падлічваецца нанесеная прыродзе шкода, што адбываецца з канфіскаванай рыбай. Неад'емнай часткай навучання сталі прыклады з практыкі дзяржінспектараў, а іх у гомельскіх супрацоўнікаў нямала, бо праз вобласць праходзяць галоўныя водныя артэрыі — Дняпро, Сож і Прыпяць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*